Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

Беларускі Звон

Радыкальная тыднёвая часопісь

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Літоўскі 18.
Адрас для карэспандэнцыі і падпіскі: паштовая скрыпка № 19.
Прыймо інтэрэсантаў ад 10 да 2 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.
Падпіска з дастаўкай да хаты: на 1 год—6 зл., за паўгоду—3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес.—50 гр.

Год I. Вільня, 11 лютага 1931 г. №. 2

Сьв. † П.

14-га студзеня 1931 году памёр ад сухотаў на Плешы (у Чэхаславаччыне) на 29 годзе жыцьця

Міхась КАБЕРАЦ

інжынер.

родам са Случчыны, вядомы бел. культурнік.

У нядзелю, 15 лютага с. г. адбудзецца ў царкве сьв. Тройцы (Базыліянскія муры) а 1 гадз. ПАНІХІДА за душу нябошчыка,

аб чым і паведамляюць беларускае грамадзянства

СЯБРЫ.

Прабуджэньне Беларускі.

Як гэта ня дзіўна, у пачатку беларускага адраджэнска-вызвольнага руху мы блізу зусім не спатыкаем жаноцкіх іменьняў. І ў культурна-асьветных арганізацыях і ўстановах, і ў палітычных партыях толькі вельмі рэдка выступаюць сьвядомыя беларускі: наагул, усюды бачым поўную перавагу мужчыны.

Ня будзем на гэтым месцы разглядаць прычынаў гэтага зьявішча. Адзначым толькі, што зьявішча гэтае — вельмі сумнае; бо-ж у нашым жыцьці, як і ў жыцьці кожнага іншага народу, жанчына іграе вялізарную і нязвычайна адказную ролю, як *узгадавальніца маладых пакаленьняў*, якім — разам з сваім малаком — аддае і сваю душу, свае пачуцьці, свае ўмілаваньні або сваю ненавісьць... у нарадаў уцісненых, паняволеных, як у сваім часе і ў народу польскага, жанкі—маткі пераховуваюць нацыянальную душу, нацыянальныя імкненьні, цьвёрдую волю змагацца за вызваленьне спад чужацкага ярма. І матка—полька напэўна больш прычынілася да ўскрашэньня польскае дзяржавы, чым гэтак паважаны ў польскім грамадзянстве „нязнаны жаўнер"...

Ясна, што польскія маткі, каб узгадоўваць сваіх дзяцей на будучых барацьбітоў за бацькаўшчыну, мусілі самыя быць нацыянальна сьвядомымі. І таксама *нацыянальна і сацыяльна сьвядомай* мусіць быць кожная *маці-беларуска*, каб выпаўніць той сьвяты абавязак, які ўскладае на яе вызначаная ей самой прыродай роля. Але як-жа далёка нашым беларускам да гэтае ступені сьвядомасьці! І якую вялікую ўсьведамляючую працу сярод беларускіх жанок мусіць выпаўніць нашае сьвядомае грамадзянства, каб маці беларуска была ня толькі *фізычна* маткай сваім дзецям, але й *духова*.

Думкі гэтыя самі сабой усплываюць у галаве, калі аглядаешся назад на пройдзены беларускім адраджэнскім рухам шлях. На гэтым шляху агнявымі літарамі першая запісала свае імя *Алёізія з Пашкевічаў Кейрысовая*, вядомая найбольш пад мянюшкай „*Цётка*", ад дня перадчаснае сьмерці якое 5 лютага мінула пятнаццаць гадоў. Сьпярша рэвалюцыянэрка, пазьней — культурна-прасьветная дзяячка, а адначасна выдатная паэтка беларуская, „Цётка" паклала такія заслугі перад беларускім Адраджэньнем, што водгукі працы Яе адчуваюцца і сягоньня. Яна *першая спасярод беларускіх жанчын* узышла на шлях самаахвярнае грамадзкае працы, аддаўшы беларускай справе ўсе свае сілы, сваё здароўе, сваю маладасьць, сваё асабістае шчасьце. І ў бязупыннай працы на карысьць беларускага народу згарэла — стаяла да канца, быццам тая сьвечка... Але сьвятло, якое „Цётка" прынясла беларускім жанчынам, не змарнавалася: прайшлі гады, і вось— у часе вялізарнага ўсенароднага ўздыму вёскі беларускае і беларускіх працоўных масаў места — ў часе росквіту „Грамады" — мы ўжо бачылі цэлы рад актыўных барацьбітак за свой народ сярод беларускіх жанок.

Сумныя ўгодкі сьмерці „Цёткі" зыходзяцца з новай праявай прабуджэньня жанчыны-беларускі: на арэну грамадзкае працы выступае першая шырокая жаноцкая арганізацыя—згуртаваньне беларускіх жанок імёнем „Цёткі". Тое, чаго дабіцца „Цётцы" за жыцьця не ўдалося, ня глядзячы на яе стараньні, — тое зьдзейсьніцца цяпер — цераз пятнаццаць гадоў пасьля Яе сьмерці.

Выбар іменьня „Цёткі" зьяўляецца свайго роду *сьцягам-праграмай* новапаўстаўшае беларускае жаноцкае арганізацыі. Пажадаем-жа, каб яна ад гэтага сьцягу-праграмы не адыйшлася, каб была вернай выпаўніцелькай сьвятога запавету „Цёткі". Пажадаем, каб згуртаваньне беларускіх жанок даварушыла распачатае „Цёткай" дзела *прабуджэньня маткі-беларускі*, на якой ляжыць вялікі доўг перад усім народам.

У добры час!

Што рабіць?

Гэтае пытаньне стаіць перад кожным грамадзкім дзеячом, які імкнецца да адраджэньня нашага народу.

І ўсякі, хто фактычна мае на мэце гэтае адраджэньне, а не прыкрываецца ім як шырмаю для таго, каб вясьці нешта іншае — мусіць уламыць сабе поўную праграму грамадзкай працы на нашай беларускай ніве.

А ўлажыць яе вельмі ня трудна, бо ў нас у розных кірунках нашага грамадзкага жыцьця зроблена так мала, што можна пачынаць з чаго хочаш.

Толькі адно трэба памятаць пры гэтым, што, каб выканаць нават нейкую мінімальную праграму—трэба разьвіць у нашым грамадзянстве максымальную энэргію ў кірунку самадзейнасьці.

Да гэтага часу мы прывыклі, каб нехта іншы нам рабіў усё патрэбнае для нашага грамадзкага жыцьця.

Нехта павінен сядзець у Вільні і рупіцца аб усіх нашых патрэбах: выдаваць газэты і рассылаць іх дарма, друкаваць кніжкі з убыткам для выдаўца, будаваць нейкія арганізацыі і г. д.

Самадзейнасьць нашых нізоў амаль зусім не разьвівалася—і гэта дало найгоршыя вынікі.

Дэмагогія, узаемная лаянка, хворыя амбіцыі і маніі грандыёзнасьці паасобных дзеячоў, шахрайская праца і палітычнае круцельства — ўсё гэта разам узятае не магло ад'емна не адбіцца на нашым грамадзкім жыцьці. Да гэтага трэба дадаць разбурваючую працу такіх чыньнікаў, як компартыя, „Змаганьне" і іншыя, якія зусім адкрыта імкнуліся толькі да таго, каб разбурыць усе нашыя арганізацыі і падарваць веру ў пазытыўную, творчую працу, нарэшце веру ў свае ўласныя сілы.

Яны абяцалі народу райскія ўмовы жыцьця, якія наступяць пасьля разбурэньня ўсяго існуючага ладу, але і самі добра ня ведалі, калі гэта будзе і ці будзе яно наагул.

Частка народу верыла ім і ня лічыла патрэбным рабіць тое, што ім паказвалі заданьні дня.

І вось цяпер, калі мы бачым усе вынікі гэтай працы, калі наша грамадзкая праца амаль зусім супынілася, калі наша вёска знаходзіцца ў стане поўнай дэзарыентацыі — мы мусім безадкладна прыступаць да працы.

У найлепшым палажэньні знаходзяцца камуністы, якія кажуць, што „трэба толькі разбураць—і ў віхры міравой рэвалюцыі будуць вырашаны ўсе пытаньня. А цяпер такімі „пусьцякамі, як беларуская справа, ня варта займацца".

Ад Прэзыдыюму Беларуск. Цэнтрасаюзу.

Беларускі Цэнтрасаюз прыступіў да арганізацыі на правінцыі бібліотэк-чытальняў, тэатральных гуртоў і лекцыяў.

За ўсякімі спраўкамі зьвяртацца па адрэсу:

Wilno, Ostrobramska 9, m. 22 — Цэнтрасаюз

Прэзыдыюм.

Мы ня будзем крытыкаваць гэтага шкоднага і варыяцкага пагляду, які прычыняецца толькі да таго, да чаго імкнуцца і ўсе ворагі беларускага народу, якім залежыць на яго цемнаце і нацыянальнай несьвядомасьці.

У той час, як усе разбурваючыя элемэнты маюць сваю „праграму"—нацыянальна-сьвядомая частка нашага грамадзянства павінна таксама стварыць сваю, пазытыўную праграму, але гэтага аднаго мала.

Трэба здолець яе зрэалізаваць — і гэта найгалаўнейшае.

Трэба здолець падыйсьці да нашага народу, зацікавіць яго, разбудзіць яго давер у магчымасьць такой працы, які ён амаль ужо страціў, дзякуючы шматлікім прычынам.

Далей трэба дабіцца такога палажэньня, каб гэты народ заварушыўся, каб у ім выявілася тая самадзейнасьць, якая зьяўляецца самым вартасным зьявішчам у кожнай грамадзкай працы. Бяз яе мы нічога не пабудуем і нічога ня зробім.

Мы бачым гэта на прыкладзе розных казённых арганізацыяў, дзе ўся праца зводзіцца да пісаньня розных паперак і фікцыйных справаздачаў.

Працу ў гэтым кірунку могуць вясьці сярод беларусаў толькі беларускія арганізацыі, толькі яны могуць разбудзіць тую самадзейнасьць, якая так патрэбна ў нашым грамадзкім жыцьці.

Трэба з сфэраў „высокай міравой" палітыкі опусьціцца на наш беларускі грунт. Трэба зацікавіцца працаю нашых самаўрадаў, здолець аказаць уплыў на іх дзейнасьць, правадзіць туды сваіх людзей, каб яны рупіліся аб беларускай справе.

Ня можна далей паступаць так, як было гэта да апошніх часоў, калі справамі самаўрадаў амаль ніхто не цікавіўся.

На анэкдот падобен напр. той факт, што ніхто з нашых б. паслоў не зрабіў ніводнага дакладу на самаўрадовыя тэмы, у нашых кнігарнях здаецца няма ніводнага лістка, прысьвечанага гэтым пытаньням.

Трэба будаваць коопэратывы, але будаваць іх не для таго, каб там знаходзілі прытулак розныя „ячэйкі", а для таго, каб яны ў выніку сваёй працы зьнішчожылі прыватны гандаль і зрэфармавалі сельскую гаспадарку. Такая коопэратыўная праца нам патрэбна і яна прыняслаб-бы вялікую карысьць грамадзянству, — значэньне якой пакуль што мала хто разумее.

Працы многа, але будзе шмат і перашкодаў з розных бакоў.

Баяцца іх аднак ня трэба. Трэба з вераю глядзець на свае сілы і адкідаць парады ўсіх тых „дабрадзеяў", якія шмат нам абяцаюць у будучыні, але пакуль што нічога добрага нам не далі. „Лепш мець сініцу ў руках, чым жорава ў небе".

Трэба гартаваць свой нацыянальны характар, трэба сконцэнтраваць сваю энэргію ў тым кірунку, які вядзе да нашага адраджэньня.

Той труднай працы, якая патрэбна для асягненьня нашых канчальных мэтаў — ніхто за нас ня зробіць. Мы самі, сваімі ўласнымі высілкамі, а часта-густа цярпючы крыўды і несправядлівасьці,—павінны іісьці цярністым шляхам, які вызначыла нам гісторыя.

Агульны абавязак.

Баявым лёзунгам у цяжкім жыцьці нашага народу ў цяперашні мамэнт зьяўляецца дамаганьне школы ў роднай мове.

Адначасна з напружанай працай найбалей выдатных асобаў у гэтым кірунку мы павінны павясьці ня менш шчырую працу і ў другой галіне нашага жыцьця, якая мае вялізарнае значэньне для дабрабыту і сьвядомасьці нашага грамадзянства. Гэта галіна—кооператыўная.

Вельмі вялікім ворагам разьвіцьця і пашырэньня кооператыўнае працы сярод беларускага грамадзянства зьяўляецца незацікаўленьне ёю ня толькі нашага селяніна, а на жаль і інтэлігента. Як магілкавы помнік душыць гэтае наша незацікаўленьне шмат і другіх добрых ідэяў і пачынаньняў. Але, калі нам пакуль што цяжка развярушыцца якой-небудзь ідэяй дзеля яе самой ці з сумліўнай карысьцю для сябе ў бліжэйшай будучыні, дык мы павінны хаця ж умець перамагчы сваю санлівасьць і апошнюю ў выпадку бясспрэчнай карысьці ад гэтага для сябе ды ў разе, калі гэтая карысьць сама крычыць аб сабе.

Ідэя кооперацыі ўва ўсіх яе выглядах па сваёй яснасьці і простаце можа вытрымаць любы конкурс. Дык і запраўды, няма нічога дзіўнага, ці незразумелага, што нейкая колькасьць людзей яднаецца дзеля таго, каб мець магчымасьць купляць сабе спажыўныя ці іншыя прадукты магчыма лепшага гатунку і па магчыма ніжэйшай цане з першых рук,—мець магчымасьць атрымаць у разе патрэбы пазычку грошаў за невялікія процэнты і г. д.

Апрача свае асабістае карысьці, людзі гэныя прыносяць карысьць на грунце культурна-эканамічным наагул усяму грамадзянству. Яны вядуць барацьбу з прыватнымі гандлярамі, з іх злоўжываньнямі, і той зыск, які прыватныя гандляры кладуць у свой кішэнь—пры кооперацыі звычайна выкарыстоўваецца цэлым таварыствам на розныя культурна-асьветныя мэты.

У заходняй Эўропе, дзе арганізацыйны рух шмат магутнейшы, як у нас, кооператыўныя таварыствы лічаць сваіх сяброў сотнямі тысячаў і мільёнамі. Ня лічучы неабходнай патрэбай гаварыць тут аб разьвіцьці кооперацыі паасобна ў кожнай старонцы, даволі будзе ўспомніць аб яе разьвіцьці ў Швайцарыі, жыцьцёвыя варункі якой былі вельмі цяжкімі.

У сувязі з вялізарным рэакцыйным уціскам народу, надзвычайнымі падаткамі і дрэнным кіраўніцтвам ураду 40 гадоў XIX стагодзьдзя, жыцьцё народу стала немагчыма цяжкім. Вартасьць на рэчы першай патрэбы дайшла да надзвычайных памераў.

І вось у гэтую пару зьявіліся найвыдатнейшыя людзі, якія пачалі на эканамічным грунце барацьбу з зробленым праз паноў зьнішчэньнем краю і народу.

Спачатку ў гарадох, а потым і ў вёсках пачалі ўзьнікаць кооператыўныя таварыствы. Гэтыя таварыствы зьявіліся як раз у пару, бо ўсё трашчала і разлівалася ад кіраваньня няўдалага ураду. Дзяржаўны арганізм пачаў разлазіцца па ўсіх швах ад забастовак, дэманстрацыяў абадранага, голага і галоднага грамадзянства.

На заклік маладых таварыстваў адклікнуліся асобы, зусім адданыя свайму народу, не страціўшыя надзеі адратаваць яго ад бяды. Яны аддалі ўсю сваю энэргію, розум і шчырую любоў справам свайго народу і, згуртаваўшыся ў кооператыўныя таварыствы, сваёю працаю хутка палепшылі дабрабыт грамадзянства і дзяржавы.

Пара і вам узяцца за працу на гэтым грунце. Неабходна выклікаць у грамадзянства давер да згуртаваньня і працы на кооператыўным грунце, а гэты давер зьявіцца тады, калі будзе пашырана сярод грамадзянства сьвядомасьць аб значэньні ў яго жыцьці і на яго карысьць кооперацыі.

Хто ў нас павінен стаць на чале гэтае справы? Інтэлігенцыя — як сьвецкая, так і духоўная. Тут шырокі прастор для працы людзей розных пагляд аў: палітычных, сацыяльных і рэлігійных. На гэтым грунце могуць аб'яднацца ўсе, хто запраўды шчыра любіць свой родны народ і жадае яму дабра.

Вялікі ўдзел у гэтай працы павінна прыняць духавенства, бо праца на грунце кооператыўным па сваёй сутнасьці запраўды блізкая да працы на грунце рэлігійным. Яна імкнецца вырашыць у духу хрысьціянскім вялікія праблемы практычнага жыцьця: як запоўніць непраходную прорву паміж багатымі і беднымі, як зьнішчыць антаганізм паміж капіталам і працаю, як наладзіць, каб разьвіцьцё тэхнікі палягчала працу працаўнікоў замест таго, каб зусім пазбаўляць іх працы і г. д.

Кооперацыя павінна зьнішчыць прымусовую працу падобна таму, як хрысьціянства зьніштожыла рабства.

Сьвяшч. А Коўш.

Палітычнае жыцьцё.

Польшча.

Бюджэт у Сойме.

Бюджэтная камісія Сойму закончыла разгляд бюджэту і прыняла яго ў агульнай суме 2.843 003.780 зл. ці блізу 3 мільярдаў.

Уся ўрадовая прэса падчырківае тую шпаркасьць і рэчовасьць, з якімі быў прыняты ў камісіі бюджэт. Уся апазыцыйная прэса, як і прадстаўнікі апазыцыі ў Сойме, выражаюць сумліў у рэальнасьці такога высокага бюджэту—пры так панізіўшымся роўні агульнагу дабрабыту ў краі.

Працэс аб замаху на марш. Пілсудскага.

У Варшаве ўсьцяж цягнецца судовая расправа ў справе „замаху" на жыцьцё марш. Пілсудскага. Апазыцыйная прэса—на падставе судовага сьледства—цьвердзіць, што ў ва ўсей справе вялікую ролю адыграла правакацыя. У апошнія дні справа гэта скомплікавалася новай справай: замахам на жыцьцё галоўнае сьведкі ў працэсе, а можа, і правакатара, як цьвярдзяць падсудныя, нейкага Пужыцкага, які аднačасна і ўваходзіў у склад тэрорыстычнай баёўкі і інфармаваў аб ёй паліцыю. Цікаўна, што гэтую сьведку — для замаху на яго жыцьцё — схапілі нейкія два „тэрорысты", павязьлі яго, стралілі, прылажыўшы рэвальвар да яго віску, у яго галаву ў упор, але ён... астаўся жывы: куля — нейкім цудам — прабіла толькі скуру. Наагул, справы — усе вельмі цёмныя.

Прэм. Славек аб Берасьці.

На паседжаньні Сойму 26 студзеня прэм'ер Славэк даў урэшце адказ на інтэрпэляцыю ў справе „Берасьця". Прэм'ер заявіў, што арышт павадыроў партыяў быў канешным, бо інакш іх „руйнуючая дзеяльнасьць" магла нарабіць шмат шкоды дзяржаве. Тое, што арыштаваных паслоў пасадзілі у ваенны вастрог у Берасьці—так сама было канешна: у Варшаве пакінуць іх у турме было небясьпечна — партыйныя баёўкі маглі зрабіць спробу звальненьня іх, дык прышлося-б можа, праліць напрасна кроў. Рэжым у Берасьці ці быў цяжкі? Праўда, але старыя барацьбіты за Польшчу яшчэ горш цярпелі ў турмах заборцаў. Ці былі гвалты? „Я сам,—казаў прэм.—расследаваў справу і сьцьверджу, што ані садызму, ані зьдзекаў ня было. Вязьняў толькі змушалі да послуху; калі ўпіраліся, дык нават і сілком"...

Урадовая прэса піша, што гэтым адказам „замыкаецца ўся справа „Берасьця". Але апазыцыя — наадварот — цьвердзіць, што ў Сойме мае яшчэ ўзнавіцца ў справе гэтай дыскусія, дый што наагул прэса не пакіне справы, пакуль яна ня будзе высьветлена да канца.

Праект аб зьмене канстытуцыі.

6 лютага г. г. Соймавы Клюб Беспартыйнага Блёку злажыў маршалку Сойму праект новай канстытуцыйнай уставы, падпісаны 111 пасламі гэтага клюбу.

У матывах, якія далучаны да гэтага праекту, кажацца, што канстытуцыя з 11 сакавіка 1921 г. не адпавядае сучасным вымогам дзяржаўнага жыцьця і што зьяўляецца патрэбным узмацьніць уладу Прэзыдэнта, каб запэўніць дзяржаве трывалую і сільную выканаўчую ўладу, здольную да творчае працы і свабодную ад пераменных уплываў партыйных угрупаваньняў.

Працэс аб дэманстрацыі Цэнтралеву.

4 лютага ў Варшаўскім акружным судзе пачаўся працэс аб дэманстрацыі 14 верасьня, наладжанай паслоў: Дзенгелеўскім, Ходынскім і інш. Дэманстрацыя, як ведама, скончылася крывавымі сутычкамі з паліцыяй. Сьведкам так сама выступае той самы Пужыцькі.

Арышт 350 сяброў П. П. С. Лявіцы.

1 і 2 лютага ў Лодзі адбыўся кангрэс П. П. С.-лявіцы. Праца кангрэсу адбывалася пры зачыненых дзьвярах. Але, калі пачалі прыймацца рэзалюцыі кангрэсу,— вельмі вострага характару — у памешканьне кангрэсу была ўведзена паліцыя, якая арыштавала блізу 350 сяброў. Сярод іх, як пішуць газэты, было 2 відных камуністаў.

Ф. Акінчыц.

На аграрныя тэмы.

(друкуецца, як дыскусыйны матэрыял).

(Працяг)

Мы маем падставу сумлявацца ў такіх сацыялістычных настроях сучаснага селяніна і думаем, што ён і пры рабочым урадзе Каўцкага будзе ўважаць за лепшае сініцу ў руках, чым таго жорава, каторага яму будуць абяцаць аграрные тэарэтыкі.

Канструкцыйная частка сацыялістычнай аграрнай праграмы зусім не распрацавана ў сучаснай літэратуры, што і было адзначана, між іншым, Стучкай у прадмове да вышэйуспомненай кнігі Каўцкага, перадрукаванай у Саветах новым выданьнем.

Ня будзем аднак адхіляцца ў гэты бок. Для нас зусім хопіць выявіць той бяссумліўны факт, што сучасныя сацыялістычныя партыі яшчэ не распрацавалі поўнасьцю сваіх праграмаў, якія датычыцца рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

З-за гэтых пытаньняў у сацыялістычнай літэратуры існуе вялікая разнагалосіца і вельмі шмат тэарэтыкаў сацыялізму проста адхіляюцца ад іх, як „несваячасных" і здатных да развязаньня толькі на практыцы. Ня прыходзіцца нам казаць наколькі неправільным зьяўляецца падобны спосаб разважаньняў.

Развязаньне таго ці іншага пытаньня можа быць праведзена на практыцы толькі тады, калі яно ўсебакова перадумана і перадусім вырашана ў теорыі.

Асаблівае значэньне гэтае пытаньне мае ў аграрных краёх, як напр. у Польшчы, аднак і тут да гэтага часу мы яшчэ нічога ня чулі, каб польскія сацыялістычныя партыі мелі гатовы плян рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на сацыялістычных падставах, каторы-б яны маглі праводзіць у жыцьцё на другі дзень пасьля таго, як быў-бы створаны чыста сацыялістычны габінэт міністраў.

Уся аграрная праграма польскіх сацыялістаў, як і ўсіх іншых — абмяжоўваецца агульнымі месцамі і фразамі, дапускаючымі рознабаковае тлумачаньне і разлічана, галоўным чынам, на вонкавы эфэкт сярод цёмных масаў сельскага насельніцтва.

Такая партыя, як P. P. S. усю сваю увагу скіроўвае на парабкаў і безьзямельных, не звярочваючы зусім увагі на асноўную сялянскую масу, сярэдня-заможную яго частку. З гэтай часткай селянства, P. P. S. на другі дзень пасьля захопленьня ўсяго дзяржаўнага апарату таксама ня ведала-б што рабіць, як ня ведаюць гэтага камуністы ў Сав. Расеі.

Іх падпорай на вёсцы былі-бы парабкі і малазямельныя, г. зн. такіе элемэнты, якія, дзякуючы спэцыфічным умовам, у каторых яны жывуць, менш за ўсё здольны да канструкцыйнай дзеяльнасьці.

Адзінае, што можна дапусьціць гэта тое, што парабкі ў найлепшым выпадку засталіся-б парабкамі ў тых маёнтках, у каторых яны працавалі раней з тэй толькі розьніцай, што гэтая маемасьць перайшла-б у ўласнасьць дзяржавы.

Ёсьць падставы думаць, што большая частка парабкаў нястрымана імкнулася-б да атрыманьня надзелу зямлі на правох прыватнай уласнасьці.

Што-б там ні здарылася,—для нас бясспрэчным фактам зьяўляецца тое, што і P. P. S., як і сучасныя камуністы, спаткаліся-б на вёсцы з непасільнымі для сябе перашкодамі пры ўрэгуляваньні там сац. эканамічных адносін на сацыялістычных падставах.

Бессумліўна для нас і тое, што пры адсутнасьці апрацаванай пазытыўнай праграмы ў галіне будовы сацыялізму на вёсцы — атрымаўся-б рад „промахаў", „ухілаў" і ўзаемнапярэчачых мерапрыемстваў, чаго сьведкамі мы зьяўляемся ў той-жа Сав. Расеі.

Там аказалася, напр., што вельмі лёгка правясьці ў жыцьцё разбурваючую частку праграмы захопліваць землі, разганяць памешчыкаў, дзяліць іх маемасьць і т. д., але куды цяжэй збудаваць нешта падобнае да сацыялізму.

З другога боку — па сваей сутнасьці такая партыя, як P. P. S. зьяўляецца тыпічнай партыяй гарадзкога і вясковага пралетарыяту. Прыймаючы пад увагу, што ў Польшчы большасьцю насельніцтва — сяляне, якія зусім не закрануты сацыялістычным рухам—зьяўляецца пытаньне, ці могуць наступіць калі небудзь такіе варункі, каб у Польшчы сацыялістычная партыя сталася кіруючай.

Калі-ж прыняць пад увагу тое, што з кожным днём сялянства ў Польшчы ўзмацняецца арганізацыйна, здабывае клясавую сьвядомасьць і павялічвае сваю палітычна-ўдзельную вагу, то, па нашаму погляду, трэба адкінуць надзею на якую небудзь „гегемонію" пралетарыяту ў будучыні, аб каторай сучасныя сацыялісты пакуль што аткрыта не гавораць, але каторую бяссумліву яны маюць на мэце, як мэтад кіраваньня ня толькі прамысловымі, але і аграрнымі краямі.

Тое, што ўдалося (хаця і ня зусім) у Саветах—у другіх краёх можа і не паўтарыцца. Няведама чым яшчэ можа закончыцца гэта „гегемонія пралетарыяту" ў Саветах: ёсьць сур'ёзная падстава думаць, што яна прывядзе там да звычайнай контррэвалюцыі. У ўсякім выпадку ўжо цяпер справы там абстаяць так, што з гэтай, „гегемоніяй" ня зусім добра.

Адным словам, выходзіць так, што бяз сур'ёзнай праграмы па рэканструкцыі сялянскіх гаспадарак на сацыялістычных падставах, такой праграмы, якая была-б зразумелай і прыемлімай для большасьці сялянскага насельніцтва аграрных краёў — сацыялістычныя партыі ня могуць нават спадзявацца на тое, што яны пацяг-

Заграніцай.

Звальненьне Гандзі з вастрогу і яго новая праграма.

26 га студня звольнены быў з вастрогу правадыр індыйскіх незалежнікаў Гандзі. Гэтым актам англійцы хочуць злагодзіць настрої ў Індыі, каб аблягчыць увядзеньне ў жыцьцё новай для яе канстытуцыі.

Вестка аб звальненьні папулярнага правадыра ўсхвалявала ўсю Індыю.

Падарожа Гандзі з вастрогу ў Бамбэй ператварылася ў бясспынны рад маніфэстацыяў дзесяткаў і сотняў тысяч мясцовага насяленьня.

Гандзі заявіў журналістам, што ня мае ніякай злосьці ў душы проці англійцаў і, здаволены абыходжаньнем з ім у вастрозе. Чакае толькі, каб па ім былі звольнены з турмаў усе пацярпеўшыя з ім разам за адну думку яго прыхільнікі. Аднакжа, дадаў ён, гэта ані ня спыняе яго ідэйнай цьвёрдасьці і няпрымірымасьці ў дасягненьні пастаўленых ім сабе і краю задач і дамаганьняў. Сваю кампанію „пасыўнага спраціўляньня" англійскім уладам Гандзі спыніць толькі тады, калі Англія споўніць цалком наступныя 11 яго дамаганьняў.

1. Вольнасьць здабываньня і прадажы солі, 2. легалізацыя байкоту ўсіх загранічных тавараў, 3. забарона вырабу і прадажы „тоддзі" — індыйскай „нацыянальнай" гарэлкі, 4. паніжэньня залішне высокай індыйскай валюты, 5. зьменшаньне напалову зямельнага падатку. 6. зьменьшаньне напалову ваеннага бюджэту Індыі, 7. зьменшаньне напалову-ж пэнсіі ўрадоўцам, 8. наадварот—значае павышэньне мытаў на ўсе загранічныя тканіны, 9. скасаваньне манаполіі (выключнага права) англійцаў на судаходства па водах Індыі, 10. поўная ліквідацыя „палітычнай" паліцыі, вольнае права для ўсіх грамадзян — насіць аружжа дзеля самаабароны.

Англійская прэса піша, што агульнай мэтай усіх гэтых дамаганьняў Гандзі зьяўляецца жаданьне, каб англійцы не маглі аставацца ў Індыі...

Але Гандзі на гэта адказывае: „Ня зусім так, паночкі. — Каб не маглі аставацца, як валадары ды паны. Але проці англійцаў-братоў і супрацоўнікаў для дабра краю індусы ня маюць нічога, жывячы для іх належную іх высокай культуры пашану"...

З Савецкага жыцьця.

Малюнак з галіны сацыялістычнага будаўніцтва.

Пра тое, як праводзіцца „сацыялістычнае" будаўніцтва ў Савецкіх Рэспубліках, лепш за ўсё можна даведацца з Савецкай прэсы.

У газэце „Экономіческая Жизнь" (№ 11 — 1931 г.) знаходзім даволі яскравае апісаньне парадкаў пануючых у Харкаўскім „мясным камбінаце".

„Камісія, абследаваўшая Харкаўскі мясны камбінат"—піша газэта—„устанавіла, што кіраўнік мяснога камбінату ня толькі не справіўся з тымі заданьнямі, якія былі яму дадзены, але дапусьціў у сваёй працы рад негаспадарчых, праступных чынаў. Скаціна, дастаўленая на базы Харкаўскага мяснога камбінату трымалася ў выключна немагчымых, антысанітарных умовах. Ад адсутнасьці адпаведнага дагляду, несыстэматычнага кармленьня—скаціна пачала масава хварэць. На базе „мясакомбінату" заводная прадукцыйная скаціна трымалася ў неадпаведных памяшчэньнях. Дзякуючы бязладзьдзю, адсутнасьці дысцыпліны і благой гаспадаркі ў Харкаўскім мясным камбінаце наглядаліся сыстэматычныя крадзяжы мясных прадуктаў. 400 матак-сьвіней, дастаўленых на базу, якія былі назначаны для сацыялістычнага сэктару—зьгінулі дзеля таго, што за імі ня было адпаведнага дагляду.

Партыйныя (камуністычныя—рэд.) і прафэсіянальныя арганізацыі ня толькі не рэагавалі на гэтыя яўныя беспрыкладныя злоўжываньні, а наадварот, рад недахопаў у камбінаце замазвалі" (нічога дзіўнага, бо і самі добра кралі! — Рэд.). Далей у артыкуле ідзе мова пра рэпрэсіі на таварышоў-камуністаў, разакраўшых народнае дабро.

Вось такое прыблізна камуністычнае будаўніцтва наглядаецца і ўва ўсім Савецкім Саюзе..

Савецкія цэны.

У адным з апошніх нумароў „Сацыялістычнага Вестніка" знаходзім цікавыя дадзеныя, якія датычаць цэнаў на прадукты першай патрэбы на г. зв. вольным рынку ў Маскве. Цэны гэтыя наступныя: хлеб 1 руб. 50 кап. за кілё, мяса—60 р. за кілё, масла — 20 руб. кілё, яйкі—3 р. 50 кап. дзесятак, мужчынская кашуля (паношаная)—15-17 руб., камашы — 60 руб. Каб зразумець настолькі гэтыя цэны даступны для працоўнай клясы—трэба прыняць пад увагу, што сярэдні заработак кваліфікаванага работніка — 70-80 руб.

Кооперативы ня могуць задаволіць спажыўца поўнасьцю. Даволі адзначаваць, напр. тое, што квіты на гатовую адзежу могуць атрымаць з 100 жадаючых работнікаў ня больш 5—6 чалавек.

Камэнтары да гэтага, здаецца, зусім не патрэбны.

нуць за сабой сялянскія масы і калі небудзь атрымаюць у краі кіруючую большасьць.

Пры гэтакім палажэньні, у каторым гэтыя партыі знаходзяцца цяпер, яны будучы партыямі гарадзкога пралетарыяту ў пераважнасьці і ў тых краёх, дзе гэты пралетарыят састаўляе меншасьць насельніцтва, у нармальных варунках ніколі ня будзе пры ўладзе і будзе заўсёды знаходзіцца на палажэньні коаліцыйнага даважніка, з каторым буржуазныя партыі не заусёды лічацца.

Пасьляваенная гісторыя некаторых краёў паказала нам, што нават у тых выпадках, калі сацыялістычныя і канунiстычныя настроі былі праз пэўны час кіруючымі — яны не маглі доўга ўтрымацца таму між іншым, што як сацыялісты, так і камуністы аказаліся без аграрнай праграмы і ня ведалі як прыступіць да разьвязкі зямельнага пытаньня.

У Італіі і Вэнгрыі пасьля днёў рэвалюцыйных захопленьняў насталі фашыстаўскія будні толькі таму, што селянства, складаючае большасьць насельніцтва гэтых краёў, пераканалася вельмі хутка, што сацыялісты абяцаюць ім у будучыні вельмі туманныя і рызыкоўныя перспэктывы. Безумоўна былі і другія прычыны, каторыя ўплылі на ўстанаўленьне ў гэтых краёх фашыстаўскага рэжыму. Але трэба мець на ўвазе, што тыя ці іншыя адносіны асноўнай сялянскай масы да фашызму заўсёды будуць рашаючымі. І так мы павінны дайсьці да таго заключэньня, што адсутнасьць грунтоўнай праграмы па рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на сацыялістычных падставах зьяўляецца для сацыялістычных партыяў такой перашкодай, якая робіць немагчымым наагул здзейсьненьне рэарганізацыі сучаснага грамадзянства на сацыялістычных падставах

(Далей будзе).

Кароткія навіны.

— У Нямеччыне судовыя ўлады цягнуць да адказнасьці аж 300 дэпутатаў парляманту — усіх за палітычную агітацыю, выходзячую з рамак закону. Зразумела, што парлямант у дэмакратычнай Нямеччыне ня „выдае" сваіх сяброў судом, пакуль ня скончацца іх пасольскія паўнамоцтвы. Але такая лічба спраў аб незаконнай палітычнай дзейнасьці сяброў законадаўчай палаты, паказывае на нейкую грунтоўную ваду ў сучасным парляментарызьме. Ня трэба казаць, што блізу ўсё справы датычаць паслоў — камуністаў і „гітлераўцаў", якіх разам якраз крыху больш за 300... Справы датычаць пераважна аружных выступленьняў. Абедзьве скрайнія партыі маюць шмат складаў аружжа, якія ўсьцяж выкрываюцца і канфіскуюцца паліцыяй.

— Маскоўская прэса вельмі цікавіцца, як заўсёды, Польшчай, даводзючы, быццам „фашыстаўская Польшча" ўсьцяж рыхтуецца да вайны з СССР...

Маскоўская прэса „падлічыла", быццам за апошніх 7 гадоў лічба ваенных заводаў — у Польшчы павялічылася з 6 да 32, а колькасьць работнікаў на іх — з 4.000 да 45.000. З свайго боку—польская прэса раскрывае, як шпарка сотні нямецкіх інжэнэраў будуюць фабрыкі ваеннай прамысловасьці—як для патрэбаў Чырвонай арміі, таксама і для Нямеччыны, якой азбраеньне забаронена Вэрсальскім Трактатам.

Адным словам, калі гэта ўсё праўда, дык найгорш дастанецца нашай шматпакутнай Бацькаўшчыне — плацдарму ўсялякай вайны паміж Расеяй і Польшчай...

— Прэса данося, што паліцыя цалком зьліквідавала Камун. Партыю Зах. Украіны. Захоплены цэнтр. камітэт у Луцку і рад правінцыяльных аддзелаў — у Львове, Тарнопалі, Перамышлю і Холме, усяго арыштавана — 32 сябры Ц. К. — усе ведамыя дзеячы партыі.

— Урад СССР прыступіў да выкананьня — прадбачанай у „пяцілетцы" праграмы будовы „цэпэлінаў". У 1931 годзе мае быць збудавана спэцыяльная майстроўня для гэтых паветраных караблёў. У першы год маюць быць збудаваны 3 вялікіх караблі — па плянах расейскага інжэнэра Варабьёва. Для прапаганды і збору грошаў рыхтуюцца „тыдні дырыжабляў".

— Некаторыя польскія газэты пусьцілі вестку, быццам у бліжэйшым часе—у зьвязку з новымі правіламі заяўкі (мэльдунку)—мае быць дакананая масавая высылка так зван. „бездзяржаўных чужаземцаў" з Польшчы. Гэта выклікала трывогу сярод расейскіх эмігрантаў у Польшчы, бо-ж толькі яны зьяўляюцца „бездзяржаўнымі". Дык урад — праз „ПАТ" — паведаміў, што вестка гэтая—няпраўдзівая.

— Характэрна, што ў СССР важнейшыя дэкрэты падпісываюць цяпер аднačасна Молатаў, як галава ўраду і Сталін, як дыктатар партыі. Такім чынам поўнае і непадзельнае адзінства дзяржаўнага і партыйнага апарату ў СССР, фактычна існаваўшае заўсёды, цяпер выяўляецца адкрыта і дакумэнтальна.

— У Кракаве—ў сувязі з ліквідацыяй камуністычных арганізацыяў — арыштавана 24 камуністаў, сярод іх 13 кабетаў.

Міхась Каберац

(Пасьмертны ўспамін)

З далёкае чужыны дайшла сумная вестка — памёр Міхась Каберац...

Ня толькі беларусы-Пражакі, якія мелі дачыненьне ў грамадзкай і студэнскай працы з нябошчыкам у Празе, але й шмат беларусаў у краі памятуе Міхася Каберца з часоў рэвалюцыйнае сумятлівасьці.

Вось жменя фактаў біяграфічных з яго кароткага жыцьця:

Радзіўся М. Каберац у вёсцы Сухоўчыцы, Слуцкага павету ў 1902 годзе. Свае дзіцячыя гады пражыў у вёсцы Кажушкі, таго-ж павету. Пачатковую асьвету атрымаў у Раманаве, дзе скончыў чатыры клясы сярэдняе школы. У 1918 годзе, з адчыненьнем Слуцкае Бяларускае Гімназіі, паступае ў лік яе вучняў. Ужо тут Міхась Каберац выяўляе сваё беларускае аблічча, актыўна працуючы ў вядомай краязнаўчай арганізацыі „Папараць кветка".

Калі ж разьлілася хваля будаўніцтва беларускае дзяржавы і пачалася тварыцца Беларуская Вайсковая Арганізацыя — Міхась Каберац адным з першых запісваецца ў яе, каб з аружжам у руках бараніць беларускую справу і зямлю ад ворагаў. Смутны эпілёг Слуцкага паўстаньня выкідае Каберца з роднага кута ў 1920 годзе, а зямлю яго акупоўваюць бальшавікі. Часова працуе ў 1921 г. нябошчык у Вільні, як беларускі вучыцель пачатковае школы на Ліпоўцы, веручы, што хутка настане час павароту да хаты. Але Рыскі мір, па якому яго хата апынулася пад бальшавікамі, змусіў прымірыцца з думкай аб эміграцыі. Ня маючы польскага грамадзянства, ў 1922 годзе выяжджае Міхась Каберац у Чэхаславачыну на дакачэньне студыяў. Здабывае ў Юзэфове матуру і ў 1923 годзе запісваецца на высокую школу ў Празе, дзе студые лясны аддзел. Цяжкія эміграцкія і студэнцкія варункі, да таго заўзятая і сумленная беларуская грамадзкая праца ў розных арганізацыях, як напрыклад: „Беларуская Рада ў Празе", „Беларускае Культурнае Т-ва ім. Скарыны", „АБСА" і г. д. — хутка падточвае здароўе. Але Міхась Каберац не зварочвае вялікае ўвагі на сваё здароўе і да таго працуе над сабой, каб скончыць высокую школу, веручы, што ягоная веда павінна прыдацца для беларускага народу і беларускай справы.

Аднак лёс ня спрыяў гэтаму, хвароба кладзе яго ў ложка. І вось 14 студзеня б. г. Каберца нястала...

Той, хто бачыў і знаў моцную і высокую постаць Каберца, узгадаванага беларускім вясковым паветрам, упрост ня можа прымірыцца з думкай, каб арганізм ягоны ня мог даць адпору гэтай страшэннай хваробе. Але той з сяброў, хто знаў бліжэй нябошчыка, зразумее прычыны. Адна з іх гэта туга па роднаму краю і бацькох, якіх бальшавікі „раскулачылі". Ці-ж мог М. Каберац перажыць пры гэткай хваробе тую крыўду, якую ўчынілі над яго бацькам бальшавікі, пасылаючы 70 ёх гадовага старыка на прымусовыя лясныя работы?!

Не на мейсцы тут раскрываць тайны Ягонае, залатое душы, ён іх панёс з сабой у магілу. Нястала Міхася... Калегі...

...і шчырага беларускага інтэлігента!...

М. І.

— На 25 лютага Комінтэрн назначыў „міжнародавы дзень безработных". У гэты дзень камуністы павінны на ўсім сьвеце рабіць мітынгі і выступленьні безработных. Высланы мелі быць інструктары з Масквы і Менску ў Польшчу. Паліцыяй быццам арыштаваны адзін з такіх „місыянэраў", пры якім знойдзены былі інструкцыі віленскім і беластоцкім арганізацыям, а так-жа 1400 даляраў.

— Хаўрус францускіх банкіраў дае быццам Польшчы пазыку ў мільярд франкаў. Але-ж ведама, францускія капіталісты, як сьцьвярджае француская прэса, выгаварылі сабе вельмі значныя карысьці і канцэсіі, паміж іншым — канцэсію на будову чугункавага шляху, які мае лучыць прамысловы раён Верхняй Сілезіі з Гдынскім портам.

— Марш. Пілсудскі мае, варочаючыся з вострава Мадэры дамоў, праехаць праз Эгіпет, Палестыну, Італію і Балканскія дзяржавы. У Польшчу маршал мае вярнуцца ў сярэдзіне Сакавіка.

— У Кіяве зачынена уладамі прыватная праваслаўная духоўная акадэмія, існаваўшая на срэдствы прыходаў, ды ўзгадоўваўшая сьвяшчэньнікаў.

— Англійскі ўрад апублікаваў „сіню кнігу"— пад назовам „Сабраньне дакумэнтаў і законаў аб палажэньні працы і працоўных у СССР". Буржуазная прэса Англіі абураецца проці таго, што робіцца з работнікамі ў СССР, даводзячы што бальшавікі завялі новы прыгон для ўсяго насяленьня вялізарнага краю.

— У Паўночнай часцы Каўказу забіта сялянамі за апо... ія часы 24 ... ецкіх урадаўцы.

— У М... (Паўднёвая Амэрыка ... апошняга ... еньня аказалася шмат забітых і раненых.

— Гварантыйны трактат праміж Польшчаю і Румыніяю прадоўжаны яшчэ на 5 гадоў.

— У Вэнгрыі пад ківаўніцтвам Паўла Страная арганізавалася фашыстаўская партыя, якая мае за заданьне аб'яднаць вэнгэрскія землі і вясьці барацьбу з камуністамі.

— У Крыме створаны г.зв. жыдоўскі раён, у склад якога ўваходзіць 36 гмінаў, з якіх 16 гмінаў чыста жыдоўскія, 3 — нямецкіх, 3 татарскіх і 14 мяшаных. Тэрыторыя гэтага раёну займае 246.000 гэктараў. 15 студзеня г. г. адбыўся першы раённы зьезд жыдоўскіх саветаў.

— У гішпанскіх унівэрсытэтах разрухі ня спыняюцца. Недаўна студэнты Барцэлёнскага ўнівэрсытэту кідалі пэтарды. Арыштаваны некалькі камуністаў, якія раскідалі адозвы.

— У Турцыі рашучымі мерамі ўраду зьліквідавана сэнсацыйнае паўстаньне рэакцыйных муллаў, здолеўшых падняць проці рэформаў Кэмаля-пашы шмат цямнейшага насяленьня краю. Усе правадыры, пераважна з сэкты „дэрвішаў", засуджаны на цяжкія кары, аж 32—на кару сьмерці. Цікаўна, што пракурор трэбаваў казьні для 80, але суд, які не шкадаваў прысудаў сьмерці, ня мог пайсьці на спатканьне пракурору: больш паловы ўсіх правадыроў мелі больш, як 65 гадоў, а такіх закон звальняе ад кары сьмерці. Цяпер турэцкі ўрад мае — зьмяніць гэты закон, бо ўвесь рэакцыйны рух у краі кіруюцца гэткімі „патрыярхамі"...

— З расейскай акадэміі навук выгнаны бальшавіцкай уладай найлепшыя гісторыкі, як Платонаў, Ліхачоў, Тарле і Любаўскі — за „маральнае ўчасьце" ў так зван. контр-рэвалюцыйнай змове. Акадэмік Любаўскі, як ведама ўславіўся, як выдатнейшы знаўца Гісторыі Літоўска-Беларускай дзяржавы. Што датычыць акад. Тарле, дык ведама ён даўно-быўшчырым спагадчыкам працоўных дый вывучаў спэцыяльна гісторыю работніцкіх рухаў на Захадзе. Але яму закідаюць, што ён—„ня верыў у сацыяльную рэвалюцыю" дый — „меў сімпатыю да Францыі", што лічыцца цяпер у ССРР — таксама — „контр-рэвалюцыйным".

— Пад націскам Францыі і Англіі нямецкі ўрад згадзіўся ня ставіць на чаргу дня справы новага перагляду пляну сплаты ваенных адшкаваньняў (так званага „пляну Юнга"), аб чым усьцяж пісала ў апошнія часы ўся нямецкая прэса.

Атрад італьянскага войска ў іх афрыканскай калёніі Кірэнайка выступіў у карацельную выправу проці непакорных жыхароў. Атрад прайшоў 800 кілямэтраў у 24 дні ў глыб краю, разьбіўшы войска павадыра паўстанцаў і захапіўшы рэшту ў палон. Аднак сам правадыр Сэф-Эн-Насер здолеў уцячы.

— Міністар фінансаў Злучаных Штатаў Амэрыкі заявіў, што грашовыя справы ўраду значна пагоршыліся, дык бюджэт мае мець у гэтым годзе недахопу аж на 350 мільёнаў даляраў...

— Англійская прэса піша, што ў Кітаі ізноў камуністам удалося здабыць значныя ваенныя пасьпехі, зрабіўшы важны урон урадавым войскам. Разьбіўшы атрад апошніх, чырвоная армія здабыла 40.000 кулямётаў і значную масу розных ваенных прыпасаў.

— На мейсца звольненага акадэміка Ігнатоўскага прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук у Менску назначаны нейкі Горын (Каляда), сябра камун. партыі, родам з Зах. Беларусі, служыўшы ў чырвонай арміі ў часе вайны з Польшчай.

Беларускія коопэратыўныя завочныя курсы.

Ужо два поўныя месяцы нармальна функцыануюць у Вільні беларускія коопэратыўныя завочныя курсы Беларускага Ст. Саюзу, пад кіраўніцтвам „Цэнтрасаюзу". Неабходным дзеля гэтага зьяўляецца паінфармаваць нашых слухачоў, а гэтак сама і ўсё грамадзянства аб тым, як выглядаюць гэтыя курсы і якую карысьць яны могуць даць слухачу і грамадзянству. Вось-жа перадусім, каб разьвіць і пашырыць коопэрацыю ўва усіх галінах, а асабліва ў галіне спажывецкай, неабходна мець адпаведнае тэорытычна-ідэйнае і фаховае прыгатаваньне. Гэтае прыгатаваньне можна здабыць толькі пры помачы навукі, у даным выпадку на коопэрат. завочных курсах, на якіх тэорытычна-ідэйнае прыгатаваньне даюць лекцыі з гісторыі і тэорыі коопэрацыі, фахавае ж прыгатаваньне належыць да такіх прадметаў, як арытмэтыка гандлёвая, бухальтэрыя, тавараўзнаўства, арганізацыя і тэхніка прадажы.

Здабыўшы гэтае прыгатаваньне часткова ўжо сьмела можа брацца за будаўніцтва коопэрацыі наагул і за вядзеньне спажывецкага коопэратыву ў паасобнасьці. (Зразумела, што далейшыя папаўненьне сваей веды заўсёды прыдасцца). Гэтаму, перад усім, другому заданьню (вядзеньню паасобнага спажывецкага коопэратыву) служаць Бел. коопэратыўныя завочныя курсы. Спажывецкі коопэратыў гэта ёсьць грамадзкая ўстанова, якою павінен кіраваць фаховец, бо начай з гары можна сказаць, што без адпаведнага кіраўніцтва коопэратыў асуджаны на загубу. Жывы прыклад гэтага мы можам прыпомніць з першых пасьляваенных гадоў, калі каапэратываў нарасло на нашай зямельцы, як грыбаў пасьля дажджу і ўсе яны пабанкрутавалі, дзякуючы недахопу адпаведнага прыгатаваньня і ідэі ў іх сяброў, а асабліва ў кіраўнікоў. Мамэнт разуменьня коопэрацыі з боку сяброў і кіраўнікоў ёсьць рашаючым ў коопэратыўным руху.

А каб гэтае агульнае зразуменьне было, каб ідэя коопэрацыі пашырылася і каб магла прыняць рэальныя хвормы ў постаці спажывецкіх коопэратываў, дык тым, хто цікавіцца і хоча працаваць у гэтым кірунку, якраз цэнную ўслугу аддае завочная мэтода навучаньня. Яна дае магчымасьць чалавеку вучыцца, не адрываючы яго ад штодзеннае працы на гаспадарцы. І той, хто сёньня разумее значэньне коопэрацыі для нас, той павінен скарыстаць з гэтага, вучыцца і кончыць гэтыя курсы. Кончыўшы павінен будзе напружыць усе свае сілы і здольнасьці, каб закласьці спажывецкі коопэратыў, вытлумачыўшы пры гэтым сялянам сваей ваколіцы значэньні коопэрацыі і тую карысьць, якую яна можа прынясьці пры адпаведным зразуменьні, салідарнай працы і ахвярнасьці ўсіх. Калі навука адчыняе вочы слухачом, дык яны павінны адчыніць вочы ўсім, паказаўшы вялікую ідэю коопэрацыі, яе значэньне, яе магутную творчую сілу. Бяз гэтага ня можна прыступіць да будовы коопэрацыі, ня можна асьмяшаць вялікае ідэі.

Вось дзеля чаго слухач курсаў павінен сумленна вучыцца, павінен кончыць курс, бо-ж яму дастаецца перадавая і кіраўнічая роля будовы коопэратыву на мясцох. Усё гэта зразумела. Кіраўніцтва курсаў і пайшло на спатканьне тым, хто хоча вучыцца, хто хоча прыняць удзел у будове народнага дабрабыту. Мінімальная аплата на курсах (усяго тры злотыя ў месяц) павінна зрабіць іх даступнымі ўсім. Увядзеньне прыйма слухачоў у любы час, гэтак сама мае на мэце пашырэньне ліку слухачоў. Бо-ж ад ліку слухачоў залежыць нармальная праца курсаў. Хто ведае ці ня можна-б было, пры агульным зразуменьні і падтрыманьні з боку грамадзянства, перарабіць гэтыя курсы ў народны ўнівэрсытэт, у якім навука коопэрацыі і гандлю мелі-б свой аддзел. Але гэта пакуль-што лятуценьні. У сутнасьці ёсьць толькі коопэратыўныя завочныя курсы, якія абыймаюць гэтакія прадметы: 1) гісторыя і тэорыя коопэрацыі, 2) арытмэтыка гандлёвая, 3) бухальтэрыя, 4) таваразнаўства, 5) арганізацыя і тэхніка прадажы. Апрача гэтых падставовых пяці прадметаў уваходзяць яшчэ два дадатковыя, гэта: а) беларускі правапіс, b) коопэратыўнае права. Лекцыі рассылаюцца па аднэй у тыдзень. Курсы будуць трываць дзесяць месяцаў. Той, хто кончыць гэтыя курсы, атрымае пасьведчаньне, якое дасьць яму права заняць мейсца кіраўніка спажывецкага коопэратыву. Спасярод слухачоў шматякія азначаюцца сваімі здольнасьцямі.

Трошкі бяды маюць курсы з неакуратным прысыланьнем выпрацаваньняў і месячнай платы, але хіба-ж гэта ўдасца паправіць, тым больш, што сярод піонэраў коопэрацыі не павінна мець мейсца неакуратнасьць.

П.

Хроніка.

— **Другі Беларуска-Украінска-Літоўскі Студэнцкі Рэпрэзэнтацыйны Баль.** У суботу, 14-га лютага г. г. адбудзецца Другі Рэпрэзэнтацыйны Баль Студэнскіх Саюзаў Беларускага, Украінскага і Літоўскага. Баль адбудзецца ў салі „Apollo" пры Домброўскага вул., № 5. Пачатак а гадз. 21-ай.

Уваход ад асобы—6 зл., для студэнтаў—3 зл.

— **Спэктакль-вечарына.** У суботу 14-га лютага г. г. адбудзецца вучнёўскі спэктакль-вечарына, якую ладзяць вучні 5 ае клясы Віл. Беларускай Гімназіі (Вострабрамская 9). Пастаўлена будзе „На Полацкім замчышчы", інсцэнізацыя ведамага твору Янкі Купалы „Сон на Кургане". Балетны аддзел ладзіць вядомая балерына п. Савіна Дольская; дэкорацыі п. Я. Драздовіча, рэжысура п. Л. Замецкага.

Уваход толькі па запросінах. Пачатак пункт. а г. 6 ўвечары. Па сканчэньні праграмы — скокі.

— **Прысуд над бел. пасламі.** 12 студзеня г. г. Віленскі Акружны Суд засудзіў 6. беларускіх паслоў з клюбу „Змаганьне"—Гаўрыліка, Дварчаніна, Крынчыка і Валынца—усіх па 8 гадоў цяжкога вастрогу. Пры гэтым супрацоўнікі сэкрэтарыяту клюбу — Астапчык, Пяткун і Жыткевіч атрымалі па 4 гады цяж. вастрогу, а недарослыя Міска і Тарасюк — па 2 гады дому паправы.

Як падаюць польскія газэты, усе засуджаныя абвінавачваліся ў дзеяльнасьці на карысьць комінтэрну.

— **Лекцыя.** У нядзелю, 1 лютага г. г., у пам. Студэнскага Саюзу адбылася чарговая лекцыя гр. Ф. Акінчыца па аграрнаму пытаньню, якая выклікала зацікаўленьне аўдыторыі.

Аб наступнай лекцыі гр. Ф. Акінчыца будзе своечасна абвешчана.

— **Вучнёўская вечарына.** У мурох Віленскай Беларускай Гімназіі адбылася 1 лютага г. г. вечарына, ладжаная вучнямі 8 клясы.

Была пастаўлена п'еса Фр. Аляхновіча „Дзьядзька Якуб", якую адыгралі вельмі добра. Асабліва выдзяляўся гр. Сіняўскі ў ролі Якуба. Саля была перапоўнена.

— **„Заранка".** У хуткім часе пачне ізноў выхадзіць дзіцячая ілюстраваная часопісь „Заранка". Падпісная цана: на год 4 зл. на 3 месяцы,—1 зл. 15 гр. Падпіска прыймаецца Вільня, Віленская 8-3.

Карэспандэнцыі.

Вёска Галавачы, Горад. пав.

Стараньнем мясцовага вучыцеля гр. Тымінскага ў пачатковай школе была зладжана вечарына-спэктакль на першы і другі дзень праваслаўных Каляд. Пастаўлена была: „Пярэстая Краоуля" і „Дзед мароз". Як з мастацкага боку, гэтак і ў сэнсе зацікаўленасьці вечарына-спэктакль прайшла вельмі добра і выклікала вялікае захопленьне ў мясцовага беларускага жыхарства. Асабліва добра згулялі свае ролі Н. Міхалевіч, А. Тымінскі і С. Панагайба. Пажадана, каб і на далей гэтая, гэтак патрэбная, праца няспынялася.

Тутэйшы.

Пэрыядычны Беларускі друк у Латвіі з 1921—1931 г.

Пачынаючы з арганізацыі беларускай нацыянальнай меншасьці ў траўні месяцы 1921 г. і да гэтага часу ў беларускіх дзеячоў і арганізацый заўсёды паўставала думка аб неабходнасьці мець свой пэрыядычны друк для асьвятляньня сваіх патрэб, для духовай сувязі паміж Латвійскімі-беларусамі, для пабудженьня іх нацыянальнага пачуцьця і г. т.

Тут мы пералічваем, што вышла з пэрыядычнага друку за 10 год працы беларускай нацыянальнай меншасьці ў Латвіі.

Першым і найбольш вялікім выданьнем была газэта

1) „Голас Беларуса" пад рэдакцыяй К. Б. Езавітава. Яна існавала з 10 чэрвеня 1925 г., калі вышаў № 1 і да 29 ліпня 1929 г.; за гэты час вышла №№ 61.

2) „Гаспадар" месячнік вясковай гаспадаркі і каапэрацыі пад рэдакцыяй Я. А. Шчорса; вышла ўсяго чатыры №№ у 1926 г.

3. „Наша Доля" орган беларускай дэмакратычнай думкі ў Латвіі пад рэдакцыяй Ц. Ю. Відаўскага, вышлі толькі чатыры №№ ў пачатку 1930 г.

4. „Праца" аднаднёўка сялянска-работніцкая; вышла ў м. Дзьвінску 29.VI. 1928 г., пад рэдакцыяй Ал. Сальцэвіча.

5. „Шлях Праўды" беларуская аднаднёўка вышла ў м. Рызе 24 X. 1930 г. пад рэдакцыяй Ф. Клагіша.

6. „Беларуская Школа ў Латвіі" пэдагогічны штомесячнік пад рэдакцыяй К. Б. Езавітава; вышла за час з 1.X. 1926 г. да 1.V. 1928 г. восем №№.

7. „Школьная Праца" часопісь Дзьвінскай дзяржаўнай Беларускай гімназіі пад рэдакцыяй С. П. Сахарава; за час 3.III. 1926 г. і да 1.I. 1931 г. вышла чатырнаццаць №№.

8 „Ластаўка" часопісь Люцынскай Беларускай гімназіі пад рэдакцыяй К. Б. Езавітава, якая выдавалася ў 1923 г., вышла шэсьць №№.

9. „Пагоня" ворган таварыства беларускае моладзі ў Латвіі пад рэдакцыяй Н. Пінскай, вышаў у пачатку 1930 г. толькі адзін нумар.

10. „Школа і Жыцьцё" — штомесячнік таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі пад рэдакцыяй М. І. Дзямідава, таксама вышаў у пачатку 1930 г. толькі № 1.

(„Школьная праца" № 14. Дзьвінск).

Рэдактар-выдавец: М. Сіняўскі

Друкарня Я. ЛЕВІНА Вільня, Нямецкая 22.